ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 187 (1456) | ПЯТНІЦА, 14 жніўня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 908.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

Комуністычная партыя мобілізуе рэволюцыйныя сілы

За Чырвоную Прусію, за Савецкую Нямеччыну

СОЦЫЯЛ-ФАШЫСТЫЯ ЎЗМАЦНЯЮЦЬ ТЭРОР, ПАТРАБУЮЦЬ ЗАБАРОНЫ КОМПАРТЫІ

КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ

Як мы ўжо паведамілі ўчора, амаль 10 мільёнаў (9.800.000) галасоў выступілі супроць капіталістычнай сыстэмы ў час галасаваньня па пытаньню аб роспуску прускага ляндтагу. Паставіўшы перад сабою мэту мобілізаваць рэволюцыйныя сілы ў пазапарляманцкай барацьбе супроць капіталістычнага ладу, ня гледзячы на выключна жорсткі тэрор, компартыя атрымала вялікія перамогі.

У дзень галасаваньня 9-га жніўня на вуліцах гарадоў Нямеччыны соцыял-дэмократычныя жандары расстрэльвалі рабочых, арганізавалі налёт на памяшканьне комуністычнай партыі, конфіскавалі комуністычную газэту „Ротэ-Фанэ", забаранілі 29 комуністычных газэт і г. д.

Нацыянал-соцыялістыя, якія былі „ініцыятарамі" ўсенароднага галасаваньня, у апошнія дні сабатавалі галасаваньне, у шэрагу месц выступіўшы супроць яго і, больш таго аказаліся дасканалымі выканаўцамі распараджэньняў тых-жа соцыял-дэмократычных міністраў расправіцца з рабочымі выступленьнямі.

Такім чынам, фашызм і соцыял-фашызм адзіным фронтам выступілі супроць рабочае клясы і комуністычнай партыі. Яны „галасавалі" зьбіеньнем дубінамі і расстрэлам рабочых. Соцыял-фашысты паказалі сваю абарону ўраду „меншага зла". А гэта спадарожвалася тым, што галасаваньнем аўладалі рабочыя рэволюцыйныя арганізацыі комуністыя, што значная частка соцыял-дэмократычных рабочых і членаў рэформісцкіх профсаюзаў перайшла з лягеру соцыял-фашызму на бок комуністычнай партыі.

Такім чынам, компартыя нанесла вялікі ўдар ураду Брауна-Зэверынга-Брунінга і яго апоры—соцыял-фашызму.

Комсамол Нямеччыны паказаў сябе верным і цьвёрдым апорам комуністычнай партыі і ў гэтай барацьбе за чырвоны плебісціт. Комсамольцы актыўна дапамагалі партарганізацыям праводзіць масавую работу. Комсамольцы праводзілі мітынгі, агітацыйныя выезды і г. д.

Комуністычная партыя Нямеччыны працягвае ўзмоцнена работу па рэволюцыйнай мобілізацыі мас. ЦК компартыі апротэставаў галасаваньне на аснове тэй вялікай колькасьці скаргаў, якія паступаюць аб прымусах і перашкодах пры галасаваньні што супярэчыць законам дэмократычнай рэспублікі. ЦК компартыі адзначае, што з прычыны гэтага сапраўдныя вынікі галасаваньня былі значна зьменены.

Урад фашысцкай дыктатуры працягвае ўзмацненьне тэрору і рэпрэсій супроць комуністычнай партыі і рабочае клясы. Соцыял-дэмократы ўжо выступаюць з патрабаваньнем забароны комуністычнай партыі, яны рашыліся стаць на тое, на што яшчэ дагэтуль не магла рашыцца буржуазія пад страхам абвастраньня клясавай барацьбы.

Лёкаі апярэджваюць сваіх гаспадароў.

Патрабаваньні арышту ЦК компартыі

БЭРЛІН, 11. Орган цяжкой індустрыі „Дэйтшэ Альгемэйнэ Цэйтунг" патрабуе арышту ЦК компартыі, Газэта пацьвярджае, што „мэўшыя месца за апошні час забойствы — не выпадковыя зьявы. Гэтыя забойствы ўяўляюць сабою асобнае зьвяно добра прапрацаванага паходу супроць дзяржаўнае ўлады". Газэта зварочваецца да суда з пытаньнем чаму ён да гэтага часу не арыштоўвае ўвесь камітэт компартыі" па бязумоўнай падазронасьці ў супольніцтве.


Бургомістр Дуісбургу „рапартуе" Зэвэрынгу

БЭРЛІН 11. У сувязі з прыездам у Дуісбург (Рэйнская вобласьць) міністра ўнутрспраў Прусіі Зэвэрынга бургомістр гораду наладзіў сьнеданьне, у час якога заявіў Зэвэрынгу: „Няма іншага выйсьця: — неабходна аслабаніцца ад выдачы дапамогі па беспрацоў'ю, Горад можа пакуль што выплачваць дапамогу толькі тым, хто знаходзіцца пад апекаю. Невядома яшчэ, ці будуць сродкі для выплаты пэнсіі служачым за жнівень. Цэлыя раёны гораду абвясьцілі сябе незаможнымі.

[illegible] на якое паліцыя арганізавала налёт і расстрэльвала каля яго на вуліцы рабочых.

У Бэрліне соцыял-фашысцкія шпікі адкрыта заносілі ўсіх галасаваўшых у асобныя сьпісы для незадаволеных і жорсткай расправы.

(З газэт).



Урна па соцыял-фашысцкаму ўзору.

Брунінг „хваліцца" Мусоліні

БЭРЛІН 11. Як паведамляе рымскі карэспондэнт „Бэрлэн Цэйтунг", Мусоліні ў перамовах з Брунінгам ацаніў „комуністычную небясьпеку" ў Нямеччыне. Мусоліні нібыта адкрыта заявіў, што рост комунізму у Нямеччыне па яго думцы, не зьяўляецца самай большай небясьпекай ня толькі для італьянскага даверра к Нямеччыне, але і для ўсякага практычнага супрацоўніцтва. У адказ на гэта Брунінг якбыццам указаў на мерапрыемствы ўраду супроць „чырвонай" небясьпекі.

Рашаючыя дні баявой падрыхтоўкі

Ленінскі комсамол і працоўная моладзь праз 22 дні будзе праводзіць сваё гістарычнае сьвята—XVII-ты МЮД.

На фронце разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва, XVII-ты МЮД зьяўляецца мобілізацыяй сіл і энэргіі ленінскага комсамолу, працоўнае моладзі на хутчэйшае і пасьпяховага выкананьне задач трэцяга, рашаюча году, на паскораньне тэмпаў будаўніцтва соцыялізму ў бацькаўшчыне сусьветнага пролетарыяту—СССР.

Разгортваньне падрыхтоўкі і правядзеньне гэтага сьвята ў нашых умовах азначае: ліквідаваць прарыў на торпараспрацоўках, дабіцца выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, ахапіць усіх комсамольцаў і рабочую моладзь ударніцтвам і соцспаборніцтвам, ліквідаваць абязьлічку, перавесьці ўдарныя брыгады на гаспадарчы разрахунак, дабіцца палепшаньня культурна-бытавых умоў рабочых.

Гэта азначае—ударнай, штурмавой работай ленінскага комсамолу забясьпечыць сваячасовы пуск новых „518" і „1040" гігантаў соцыялістычнай індустрыі. Гэта ёсьць безадкладная ліквідацыя прарыву ва ўборцы сенажацяй, азімых, яравых, тэхнічных культур, ліквідацыя прарыву ў сілосаваньні, організацыя хлебанарыхтовак, пасьпяховае правядзеньне асеньня-пасеўнай кампаніі, організацыя колгаснага прыліву, перавод колгасаў на зьдзельшчыну, організацыя працы ў колгасах. Гэта азначае—перабудаваць работу па-новаму, прыстасаваць яе да запатрабаваньняў соцыялістычнага будаўніцтва, рэалізаваць шэсьць вызначаных тав. Сталіным задач.

Уся гэтая работа, накіраваная на паскораньне тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва, павінна быць шчыльна ўвязана з барацьбой за ператварэньне ленінскага комсамолу ў шматмільённую організацыю, за 100 проц. уцягненьне рабочай, батрацкай, моладзі і перадавой колгаснай у КСМ.

Аднак тэмпы і якасьць падрыхтоўкі да 17 МЮД—зусім нездавальняючыя. Некалькі дзён таму назад бюро ЦК ЛКСМБ констатавала, што комсамольская організацыя да XVII-га МЮД'у праводзіць зусім слабую падрыхтоўку.

Па сутнасьці частка організацый яшчэ і зараз не разгарнула належнай падрыхтоўкі да МЮД'у. Не мобілізавана ўвага рабочай, колгаснай моладзі на рэалізацыю ліста ЦК УсеЛКСМ і пастановы бюро ЦК ЛКСМБ. Асабліва недапушчальна опортуністычная стаўка часткі комсамольскіх організацый на самацёк у росьце. У выніку рост КСМ па Беларусі за апошнюю пяцідзёнку значна зьменшыўся ў параўнаньні з папярэднімі. Не разгорнута работа па перадачы лепшых комсамольцаў-ударнікаў у партыю. Слаба праводзіцца работа па 100-пр. ахопу комсамольцаў і рабочай моладзі ўдарніцтвам і соцспаборніцтвам, што зьяўляецца зусім недапушчальным.

Выключнае ўвагі заслугоўвае зьмешчаная сёньня пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ аб удзеле профсаюзных організацый у падрыхтоўцы і правядзеньні XVII-га МЮД'у, якая зьяўляецца разгорнутай програмай дзейнасьці профсаюзных організацый па аказаньню актыўнай дапамогі аднаму з атрадаў шматмільённай арміі—ленінскаму комсамолу Беларусі,—правесьці 17 МЮД.

Профсаюзныя організацыі сваім удзелам у баявым правядзеньні XVII-га МЮД'у уключаюцца разам з шматмільённым комсамолам штурм за сваячасовы пуск „518" і „1040" за паскораньне тэмпаў будаўніцтва соцыялізму, на справе дапамагаюць ленінскаму комсамолу Беларусі ў барацьбе за ператварэньне яго ў шматмільённую організацыю. Гэта вынікае з тае асноўнае ўстаноўкі пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ, што „правядзеньне XVII-МЮД'у, як сьвята барацьбы і перамог пролетарскае моладзі, здабытых пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва павінна быць справай ня толькі комсамолу, але ўсіх профсаюзных організацый".

Зараз неадкладная задача кожнага камітэту і ячэйкі комсамолу: шырока разгарнуць падрытоўку да XVII-га МЮД'у, скарыстаць час, які яшчэ застаўся для ўдарных работ на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва, уцягнуць у гэтую работу ўсіх комсамольцаў і працоўную моладзь, організаваць работу так, каб кожны завод, фабрыка, колгас, саўгас адчувалі, на справе бачылі і ўдзельнічалі пад кіраўніцтам партыі ў сьвяце трэцяга рашаючага, у сьвяце барацьбы і перамог ленінскага комсамолу і працоўнае моладзі.

СУПРОЦЬ РАЗГУЛУ КРЫВАВАГА ТЭРОРУ У ПОЛЬШЧЫ

МАСАВЫЯ ДЭМОНСТРАЦЫІ ПРОТЭСТУ ПРАЦОЎНЫХ БССР

Пролетарыі Менску абавязваюцца выканаць сваё заданьне і матар'яльна дапамагчы ахвярам фашысцкага тэрору

Па дапамогу політвязьням Менск павінен даць 60.000 руб.

Па ўсіх прадпрыемствах Менску пракацілася хваля протэстаў з прычыны адозвы ЦК МОПР'у Польшчы, Заходняй Беларусі. Рабочыя на мітынгах прымалі конкрэтныя пастановы аб дапамозе політзьняволеным, аб узмацненьні інтэрнацыянальнай сувязі аб узмацненьні працы МОПРу.

11-га жніўня адбыўся сход актыву МОПРу г. Менску, на якім прысутнічала 250 чалавек. Сход прыняў пастанову аб узмацненьні кампаніі па збору сродкаў на зімовы час.

9 хворых 1-й савецкай больніцы, прачытаўшы адозву ЦК МОПРу Польшчы і Заходняй Беларусі, даюць 17 р. на карысьць політзьняволеных Польшчы.

Учора ў друкарні Сталіна адбыўся мітынг. На мітынгу выступіў былы пасол Польскага сойму Рак-Міхайлоўскі.

Усяго ў час зімовай кампаніі дапамогі політзьняволеным Менск павінен даць 60.000 р.

„У рашаючыя дні мы будзем разам з вамі і разам прыдзем да перамогі"

Мы, рабочыя заводу Варашылава, заслухаўшы весткі аб крывым тэроры, аб катаваньнях над нашымі братамі ў бела-панскай Польшчы шлем гарачае прывітаньне братом па змаганьню, якія томяцца ў засьценках дэфэнзывы.

Мы протэстуем супроць бесчалавечных зьдзекаў над братамі па клясе.

Мы добра ведаем, што з узмацненьнем наступу на рабочую клясу расьце і падрыхтоўка да нападу на бацькаўшчыну сусьветнага пролетарыяту СССР.

Браты па клясе! У адказ на зьдзекі над вамі мы яшчэ больш напружым свае сілы на пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне плянаў соцыялістычнага будаўніцтва. Мы добра ведаем, што посьпехі соцыялізму ў нашай краіне наближаюць сусьветны Кастрычнік, набліжаецца ваша аслабаненьне.

У адказ на падрыхтоўку вайны мы яшчэ больш узмацнім абароназдольнасьць краіны, мы будзем актыўна вывучаць вайсковую тэхніку, актыўна ўдзельнічаць у занятках вайсковых гурткоў і ПВО, мы ўсе, як адзін, уступаем у рады АСО і МОПРу. Мы адпрацоўваем адзін дзень: 50 проц. заработку шлем вам, а 50 проц. аддаем на ўзмацненьне абароназдольнасьці нашай краіны.

Таварышы па змаганьню! У той час, калі капіталізм усяго сьвету пачне напад на Савецкі Саюз, мы зьменім варштат на вінтоўку, мы будзем абараняць савецкую краіну з тым-жа энтузіязмам, з той-жа рашучасьцю, з якой мы зараз змагаемся на рыштаваньнях нашага будаўніцтва, з якою вы зараз змагаецеся пад сьцягам комуністычнай партыі за лепшую будучыню. У рашаючыя дні мы будзем разам з вамі і разам прыдзем да перамогі.

Няхай жыве ленінская комуністычная партыя і яе правадыр Сталін! Няхай жыве Комінтэрн!

Няхай жыве компартыя Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

УВАГА!!! Сэкратары ячэек ЛКСМБ Менскай Прыгараднай мяжы

16 жніўня 1931 г., роўна а 12 гадз. дня, у памяшканьні Менгаркому

СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА СЭКРАТАРОЎ ЯЧЭЕК ЛКСМБ МЕНСКАЙ ПРЫГАРАДНАЙ МЯЖЫ

ПАРАДАК ДНЯ: аб падрыхтоўцы да XVII МЮД'у. Сваячасовая яўка абавязкова.

Сэкратар Менгаркому ЛКСМБ Янковіч

Уздымам комсамольскага энтузіязму—узьнімаць тэмпы ўборачнай

ДРЫСЕНСКАЯ, ЛЕПЕЛЬСКАЯ, ТАЛОЧЫНСКАЯ КОМСАМОЛІЯ ПА-БАЯВОМУ ЗМАГАЕЦЦА ЗА ПЕРАМОГУ НА ІЛЬНЯНЫХ ПАЛЁХ

Масавая ўборка тэхнічных культур у поўным разгары. Комсамольскія організацыі ільнаводных раёнаў павінны зараз драцца за правільную організацыю працы на ільняных палёх, за поўнае і рацыянальнае скарыстаньне ўборачных машын, за правільную расстаноўку рабочае сілы. Яны павінны правільна расставіць комсамольскія сілы па вучастках ударнаю працай і комсамольскім энтузіязмам забясьпечыць сваячасовую ўборку тэхнічных культур.

Ад рашучай і хуткай перабудовы работы і прыстасаваньня яе да ўмоў поля і вучастку будзе залежаць і пасьпяховасьць барацьбы за тэмпы ўборкі, пасьпяховасьць барацьбы за тэхнічныя культуры.

Рад раённых комсамольскіх організацый ільнаводных раёнаў ня стаў яшчэ на чале кіраўніцтва правядзеньнем уборачнай кампаніі тэхнічных культур, яшчэ не мобілізаваў організацыю, ня кінуў комсамольскіх сіл на вучасткі барацьбы за лён.

Большасьць комсамольскіх організацый ільнаводных раёнаў нават не паведаміла ЦК ЛКСМБ і „Чырвоную Зьмену“ аб выніках праведзенай самаправеркі падрыхтаванасьці да ўборкі тэхнічных культур.

Комсамолія Лепеля, Дрысы і Талочына зразумеўшы гаспадарча-політычную важнасьць уборкі тэхнічнтх культур, правяла вялізарнейшую падрыхтоўчую работу і выступіла падрыхтаванаю ў бай за лён. Яна кінула на ўборку тэхнічных культур дзесяткі ўдарных комсамольска-маладзёжных брыгад, якія ўжо паказалі прыклады ўдарнай работы.

З ФРОНТУ ЎБОРКІ ТЭХНІЧНЫХ

Рапарты юнкорыі Лепельшчыны

Замест 16—у брыгадзе 11 чалавек

Колгас „Бядняк“ да ўборкі тэхкультур падрыхтаваны д бра. На сходзе ячэйкі сумесна з колгаснай моладзьдзю шырока абгаворана пытаньне ўборкі. Тут-жа на сходзе былі організаваны комсамольска-маладзёжныя брыгады і інш. Да ўборкі прыступлена 6 жніўня. Убрана 13 проц. агульнае плошчы.

Брыгады працуюць па-ўдарнаму. Норму 16 чалавек выконваюць брыгады ў 11 чалавек.

Юнкорпост „ЧЗ“ Лукашоў.

Разумоўскі спадзяецца на самацёк

У колгасе „Карла Маркса“ прыступлена да ўборкі 6 жніўня. Організаваны комсамольскія маладзёжныя брыгады, якія за тры дні ўбралі 3 га лёну, што складае 14 проц. агульнае плошчы. Праўленьне колгасу бязьдзейнічае, недаацэньваючы справу ўборкі тэхкультур. Старшыня колгасу Разумоўскі, спадзяючыся на самацёк, ня кіруе ўдарнай работай.

Брыгада „ЧЗ“ Прудзік, Гарбачэўскі.

Уборка праводзіцца брыгадамі

У колгасе „Чырвоны Прамень“ да ўборкі тэхнічных праведзена вялікая падрыхтоўчая праца. Уборку колгас пачаў 10 жніўня. Організаваны брыгады, у склад якіх уваходзіць па 15 чалавек.

Юнкорпосу „ЧЗ“ Балотнік, Вашкевіч.

Райколгассаюз не дасылае рабочыя праграмы

У колгасе „Чырвонаармеец“ прыступлена да ўборкі 6 жніўня. Організаваны 6 брыгад з 90 чалавек. Убрана 5 га лёну. Падрыхтаваны месцы для сушкі. Райколгассаюз да гэтага часу не даслаў рабочыя програмы і наогул ніякай практычнай дапамогі не аказвае.

Юнкор „ЧЗ“ Асінаўскі.

Скараціць тэрміны ўборку

Комсамольскія ячэйкі колгасаў Палянскага сельсавету, Лепельскага раёну, у час самаправеркі падрыхтаванасьці да ўборкі тэхнічных культур пастанавілі правесьці—9-га жніўня па ўсім сельсавеце сумесна з усімі колгасьнікамі суботнік па сілосаваньню з тым, каб, выканаўшы плян сілосаваньня, прыступіць да ўборкі тэхнічных культур.


У часе самаправеркі вылучаны брыгады па ўборцы тэхнічных культур у колгасах! „Новыя горкі“, „Праца“, „Перамога“, „Ударнік“ і „Парыская комуна“.

Колгас „Парыская комуна“ пастанавіў уборку тэхнічных культур скончыць за адзін дзень. Колгас „Ударнік“ 7-га жніўня распачаў уборку лёну, інвэнтар замацаваны да кожнай брыгады.

Для асьвятленьня ходу ўборкі тэхкультур па ўсіх 11-ці колгасах Палонскага сельсавету організаваны юнкораўскія пасты „Чырвонай Зьмены“.

Колгасы Палонскага сельсавету павінны напрудзіць усе сілы і сваячасова закончыць уборку лёну і канапель.

Мальчэўскі А.



Уборка пшаніцы ў саўгасе Зазер'е Сьмілавіцкага р-ну

Талочынскі комсамол ліквідуе адставаньне

Юнкораўскія брыгады штурмуюць прарывы ва ўборцы лёну

Талочын, 10-VIII—(выязная брыгады „Чырв. Зьмены“)

6-га ліпеня ўся Толочынская комсамольская організацыя была ўзьнята на баявую праверку падрыхтаванасьці да ўборкі канапель і лёну. Райкомам комсамолу, сумесна з выязною брыгадай „Чырвонай Зьмены“, складзена 15 комсамольскіх брыгад, якія выехалі на раён.


8-га жніўня самаправерачныя комсамольскія брыгады скончылі баявую праверку на мясцох. У колгасах і саўгасах організаваны юнкораўскія пасты выходзяць насьценныя газэты „Ударнік уборачнай“. Усе недахопы ў падрыхтоўцы тэхнічных культур брыгады выпраўлялі на месцы, аставіўшы конкрэтныя заданьні ячэйкам.

7-га жніўня праведзены рэйд юнкораўскіх брыгад па пытаньню, як падрыхтаваліся раённыя ўстановы, сельсаветы і паасобныя буйныя саўгасы і колгасы да ўборкі і апрацоўкі ільна і канапель. У рэйдзе 20 брыгад удзельнічалі местачковы актыў, колгасьнікі, курсанты ФЗВ.

Брыгады правялі ў колгасах сходы, выявілі ўсе недахопы ў падрыхтаванасьці да ўборкі і апрацоўкі тэхкультур, выпусьцілі спэцыяльны нумар газэты „Ударнік уборачнай“ і прапрацавалі пастанову Наркомзему і Колгасцэнтру.

Комсамольская організацыя па-баявому ўзялася за правядзеньне ўборкі і апрацоўкі тэхнічных культур.

Крутаўцоў П.



За… …одзь уборку азімых

Выязная брыгада „Чырвонай Зьмены“

Колгасы лепельшчыны пачалі уборку тэхнічных культур

Лепель. 9. Лепельскі раён у гэтым годзе мае 5146 га плошчы, засеянай тэхнічнымі культурамі. Комсамольская організацыя Лепельшчыны добра зразумела, што сваячасовая ўборка тэхнічных культур—яе баявая першачарговая задача і абвясьціла сябе мобілізаванай на пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі тэхнічных культур. Яна разгарнула шырокую масавую работу сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў, павяла рашучую барацьбу з абязьлічкай, за ўкараненьне зьдзельшчыны, організавала вытворчыя комсамольска-маладзёжныя брыгады па ўборцы лёну, дабілася прымацаваньня брыгад, інвэнтара і цягавай сілы да паасобных вучасткаў.

Складзеныя комсамольскімі ячэйкамі брыгады 6-га жніўня ўжо распачалі ўборку тэхкультур у большасьці колгасаў раёну. Значная частка колгасаў, дзякуючы добра праведзенай падрыхтоўцы і добрай працы ўдарных комсамольска-маладзёжных брыгад, з першых дзён працы паказала бліскучыя вынікі.

Колгас „Бядняк“ за тры дні ўбраў 13 га лёну, што складае 13 проц. ад агульнай плошчы. Колгас імя Карла Маркса за тры дні ўбраў 6 га лёну, што складае 14 проц., „Чырвонаармеец“ убраў 5 га лёну, „Комінтэрн“—10 га і г. д.

Колгас „Чырвоны ўдарнік“ замест дня адпачынку абвясьціў 9-га жніўня ўдарны суботнік па ўборцы тэхнічных культур, на які выйшлі ўсе колгасьнікі.

У раёне ёсьць такія колгасы, якія недаацэньваюць значэньня сваячасовай уборкі тэхнічных культур і не падрыхтаваліся да яе. Колгасы забеліна, „Шлях Леніна“ самі бязьдзейнічаюць і затушоўваюць ініцыятыву комсамольскіх ячэек стварыць на час уборкі ўдарныя комсамольска-маладзёжныя брыгады. У гэтых колгасах яшчэ не прапрацаваны плян ўборкі тэхнічных культур, не праведзена масава-растлумачальная работа сярод колгасьнікаў.

У некаторых колгасах дагэтуль няма рабочых програм уборкі лёну, ня гледзячы на тое, што яны ўжо 6-га жніўня распачалі ўборку.

Лепельская комсамольская організацыя павінна шырока разгарнуць соцспаборніцтва паміж паасобнымі ячэйкамі на пасьпяховае і хутчэйшае правядзеньне ўборкі тэхнічных культур, паказаць прыклады бальшавіцкае працы, якія забясьпечаць ёй перамогу.

Зьм. Кузьменка.

240 га ёсьць

ЛЕПЕЛЬ, 11-VIII-31 г. (Па тэлеграфу ад нашай брыгады). Пачалася масавая ўборка лёну. На 10 жніўня ўбрана 240 га. Комсамольская організацыя па-ударнаму змагаецца за посьпех уборкі тэхнічных.

КУЗЬМЕНКА.

Выезная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“

Да 17 МЮД'у Дрысеншчына рыхтуе рапарт дасягненьняў

ДРЫСА, 9. Раённая нарада сэкратароў комсамольскіх ячэек, праведзеная 9 жніўня райкомам КСМ па пытаньню ўборкі тэхкультур, паказала, што большасьць комсамольскіх ячэек раёну ў асноўным пераключылася на ўдарныя тэмпы ўборкі і апрацоўкі лёну.

Комсамольская маладзёжная брыгада будзе мацаваць посьпех

У радзе колгасаў з комсамольскай моладзьдзі складзены спэцыяльныя брыгады, якія ўжо прыступілі да ўборкі лёну (комуна „Новая культура“).

У колгасе „Ясная Паляна“ на ўборку лёну кінуты дзьве комсамольскія брыгады па 10 чалавек. У організаваных брыгадах колгасьнікаў брыгадзірамі зьяўляюцца комсамольцы.

Уборка лёну распачалася і ў саўгасе Баркавічы. Комсамольскія брыгады гэтага саўгасу з першых дзён паказваюць узоры бальшавіцкай работы.

Гэроі абломаўскіх тэмпаў

Рад ячэек усё-ж ганебна бязьдзейнічае на фронце разгортваньня ўборкі лёну. Валынецкая ячэйка яшчэ нават не прыступіла да абгаварэньня плянаў уборкі, не організаваны брыгады. Кіраўніцтва ячэйкі недаацэньвае політычнай важнасьці барацьбы за тэмпы ўборкі.

Такое-ж становішча і ў ячэйцы колгасу імя Дзяржынскага. Ячэйка ня ведае, калі колгас выходзіць на ўборку лёну, пляны не абгавораны, брыгады ня складзены, праца не наладжана.

Опортуністычны самацёк пануе і ў Юльянаўскай ячэйцы. Комсамольцы да ўборкі лёну не падрыхтаваны, няма брыгад, няма плянаў уборкі. Опортуністыя з гэтай ячэйкі гавораць, што лён яшчэ зялёны, дык яны пасьпеюць, сьпяшацца няма куды.

МТС зрывае ўборку

Па многіх колгасах уборку лёну зрывае МТС, якая зусім дрэнна падрыхтавалася да ўборачнай кампаніі У комуне „Новая Культура“ засеяна 51 га лёну. Па ўмове, 80 проц. гэтай плошчы павінна быць убрана Боркавіцкай МТС. Зараз у комуне ўборка пачалася, а МТС на працу не выяжджае. У колгасе „Ясная Паляна“ МТС таксама зрывае

Пераможцам—першае месца ў МЮДаўскай колёне

Нарада, заслухаўшы інфармацыю бюро ячэек аб ходзе ўборкі лёну, дала рад конкрэтных указаньняў у іх дальнейшай працы.

Райком ЛКСМБ вызначыў для тых ячэек, якія па-бальшавіцку справяцца з задачамі ўборкі лёну, прэміі: пераходны сьцяг РК ЛКСМБ і першае месца ў мюдаўскай колёне.

Аб сваіх дасягненьнях комсамольскія ячэйкі будуць рапартаваць XVII МЮД'у.

Казлоў, Канончык.

Да сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ

Пераможным комсамольскім штурмам ліквідуем прарывы ў сілосаваньні

Рад раённых комсамольскіх організацый колгасаў ганебнейшым чынам зрываюць пасьпяхове выкананьне плянаў па сілосаваньню. Яны правялі паўнейшую бязьдзейнасьць, чым сарвалі забясьпечаньне жывёлы кармамі.

Комсамольскія організацыі павінны безадкладна перабудаваць сваю работу, пераключыць яе на ўдарныя тэмпы і да XVII МЮД'у прыйсьці з выкананымі плянамі сілосаваньня.

„У нас бяз сілосу хопіць кармоў“.

ВІЦЕБСК. Забясьпечаньне жывёлагадоўлі кармоваю базай набывае важнейшае значэньне, але праўленьне колгасу „Чырвоны мурашнік“ Бараўлянскага сельсавету зрывае стварэньне гэтай базы.

Згодна кантрольнага пляну Райколгассаюзу, колгас павінен заклаcьці 30 тон сілоснай масы. Лічба зусім рэальная, але праўленьне колгасу нават і ня думае брацца за капаньне сілосных ям, кажучы: „у нас і бяз сілосу кармоў хопіць“ Комсамольская ячэйка бязьдзейнічае.

У бліжэйшы час неабходна прыступіць да сілоснага будаўніцтва з тым; каб выканаць плян сіласаваньня.

Давід У-ін.

Замест 300—30

У колгасе „Чырвоная Зьмена“, Зембінскага сельсавету, Барысаўскага р-ну, ячэйкі нічога ня робяць для таго, каб выканаць пляны сілосаваньня. Плян выкананы толькі на 10 проц.

Крывіцэ.

Выканаць плян

БАРЫСАЎ, 9. Плян сілосаваньня па Барысаўскім р-не выконваецца недапушчальна марудньмі тэмпамі. Цэлы рад комсамольскіх ячэек бязьдзейнічае і ня думае выконваць дырэктыву партыі і ўраду.

Ячэйкі колгасу „Комсамолец“, вёскі Трасяніца і Хаўхаліцы пытаньнямі сіласу яшчэ не займаліся.

Комсамольскія ячэйкі павінны разгарнуць шырокую работу па сілосаваньню і забясьпечыць выкананьне пляняў.

А. Пялінскі.

Сілосная вежа павінна быць пабудавана

Колгас „Прамень комуны“, (Слуцкі раён) мае жывёлагадоўчы ўхіл, у ім зараз налічваецца 129 кароў і 30 цялят.

Па пляну, у колгасе павінна быць пабудавана сілосная вежа. Але толькі сёлета заклалі фундамэнт. Комсамольская ячэйка зусім бязьдзейнічае і ня прымае ніякіх мер, каб забясьпечыць пабудову ужо пачатай вежы. Пытаньне аб сілосаваньні на агульным сходзе не разу ня ставілася, ня ўзьнімалася таксама пытаньне аб зрыве будаўніцтва сілоснай вежы.

РК КСМ ня ведае, як комсамольская ячэйка колгасу „Прамень комуны“ змагаецца за сілос і ня прымае ніякіх мер, каб зьнішчыць бязьдзейнасьць яе у справе сілосаваньня.

Сіласная вежа павінна быць пабудавана, а для гэтага неабходна зараз жа мобілізаваць усю комсамольскую ячэйку, усіх колгасьнікаў на сканчэньне па-ўдарнаму сілоснай вежы і на запаўненьне яе сілоснаю масай.

Брыгадзір „ЧЗ“ Прыбытак Я.

У ЦЭХУ, БРЫГАДЗЕ, ВА УДАРНАЙ УБОРЦЫ МНОЖЫЦЬ РАДЫ ШМАТМІЛЬЕННАГА

Ня зьніжаць тэмпы! Якасьць і замацаваньне росту—цэнтральная задача

З сёньняшняга матар'ялу па росту відаць, што выкананьне рашэньня па ператвырэньні комсамолу ў шматмільённы яшчэ не забясьпечана. Тэмпы росту ня могуць быць прызнаны здавальняючымі. Мы вымушаны таксама констатаваць недапушчальнае скажэньне лініі ў росьце, якое дапушчана ў Стара-Дароскім раёне. Тут, замест сапраўднага росту за лік рабоча-батрацкай і лепшай колгаснай моладзі, пачалі прымаць кулацкіх сынкоў. Мы патрабуем неадкладна прыцягнуць да адказнасьці парушаючых лініі росту.

Адначасова з гэтым трэба адзначыць, што Гомельскі, Барысаўскі, Віцебскі, Менскі гаркомы не даюць зводак аб росьце, гэта ня толькі недапушчальная халатнасьць, гэта прымушае гаварыць аб слабой рабоце гэтых гаркомаў па росту. Таксама паслаблена работа па перадачы ў партыю.

Работа нашай выязной брыгады, якая організавала ячэйку ў Чырвона-Слабодзкім раёне, сьведчыць аб тым, што пры разгорнутай масавай рабоце тэмпы росту могуць быць павышаны.

Змагаючыся з самацёкам і скажэньнем лініі росту, мы абавязаны дабіцца павышэньня тэмпаў росту.

Опортуністычны самацёк плюс „очковтирательство"—

Вось мэханіка кіраўніцтва колектыву будаўнікоў у Воршы

Пасьля апошніх пленумаў ЦК ЛКСМБ, Аршанская організацыя мае некаторы зрух у росьце. Аднак рад колектываў комсамолу, замест мобілізавацца на практычнае выкананьне рашэньняў IX-га зьезду комсамолу аб ператварэньні комсамольскай організацыі ў шматмільённую, дагэтуль опортуністычна недаацэньваюць рост організацыі.

Адзін з буйнейшых колектываў КСМ Аршанскага раёну — колектыў будаўнікоў ЧСУ—4 ст. на будаўніцтве якога працуе 1100 чалавек рабочае моладзі комсамольскага ўзросту, уцягнуў у рады КСМ за апошнія два месяцы усяго 58 чалавек 9 проц. Усё гэта сьведчыць аб тым, што бюро колектыву КСМ не забясьпечыла штодзённага опэрацыйнага кіраўніцтва ростам і не разгарнула шырокай масавай работы па растлумачэньню пастаноў зьездаў і пленумаў ЦК аб росьце, Таксама яўна опортуністычна адносіцца бюро і да разгляду анкет. Анкеты марынуюцца па тры месяцы што тармозіць выкананьне баявых рашэньняў аб росьце.

Колектыў ня здолеў увязаць барацьбу за прамфінплян з задачай ператварэньня комсамолу ў шматмільённую організацыю, Замест прыняць адпаведныя меры, каб палепшыць работу, сэкратар колектыву тав. Кацялоўскі займаецца „очковтирательством", дакладваючы бюро райкому КСМ. „Рост на будаўніцтве ідзе добра", Такое „очковтирательство" яшчэ больш тармозіць рост. Палітвыхаваўчая работа сярод маладых комсамольцаў таксама адсутнічае. Полігурткі не працуюць. Усё гэта сьведчыць аб злачынным самацёку ў працы колектыву па росту організацыі.

Такое кіраўніцтва ні ў якім разе ня можа забясьпечыць выкананьне пастаўленых задач па росту.

Хадневіч

Няма гаспадарчай работы, няма росту

Пры Вобальскім сельсавеце Сіраціпскі р-н дзьве комсамольскія ячэйкі, але яны зусім слаба працуюць. Рашэньні IX-га і X-га зьездаў комсамолу аб росьце яшчэ да гэтага часу сярод колгаснай моладзі не популярызаваны, дык ня дзіва, што замест росту ячэйка зьмяншаецца. Ячэйкі ніякай гаспадарчай работы не праводзяць і таму аўторытэт іх слабы. Толькі пры ўмове, калі гэтыя ячэйкі займуцца выкананьнем політычна-гаспадарчых задач у колгасе і сельсавеце і разгорнуць масава-растлумачальную работу, яны даб'юцца посьпехаў у росьце.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены" Шэцька І.

Стаўка на самацёк павінна быць біта

На Лрысенскім ільназаводзе працуе 120 чалавек, з іх моладзі 96 чалавек, або 80 проц. Аднак, ня гледзячы на такую вялікую колькасьць моладзі, якая ў асноўным рашае посьпех выкананьня прамфінплян, на заводзе, комсамольская ячэйка налічвае ўсяго 28 чалавек. За апошні час ячэйка зусім слаба расьце.

Тое-ж самае і з політвучобаю. У ячэйцы вялікая колькасьць непісьменных і малапісьменных, а кіраўнікі ячэйкі Елеманскі і Абрамсон віну за зрыў політвучобы ўзвальваюць на прамфінплян. Відаць гэтыя гора-кіраўнікі не разумеюць, што політвучоба толькі тады і ёсьць вучоба, калі яна зьвязваецца з барацьбой за прамфінплян. Райком комсамолу павінен таксама палепшыць сваё кіраўніцтва політвучобаю і ростам.

Казлоў і Канончык

Організавалі ячэйку

Выязною брыгадай „Чырвонай зьмены" сумесна з Чырвонаслабодзкім райкомам КСМ 2-га жніўня быў праведзены сход моладзі колгасу „Чырвоны баец" па пытаньню вынікаў апошніх пленумаў ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ. Пасьля дакладу лепшыя маладыя ўдарнікі-колгасьнікі падалі заяву аб прыёму іх у рады комсамолу. Кандыдатуры шырока абгаварваліся на сходзе моладзі і колгасьнікаў, у выніку організавана ячэйка комсамолу. 13 лепшых маладых ударнікаў палёў „Чырвонага байца" сталі ў рады шматмільённага [illegible] організацыі, у іх ліку 8 дзяўчат. Ячэйка адразу намеціла цэлы рад мерапрыемстваў па ўздыму ячэйкі па уборцы [illegible].

Брыгада „Ч.З." А. Сячко В. Крупка.

Прыцягнуць да адказнасьці

У Пасецкім сельсавеце (Стара-Дароскі раён)-ячэйка КСМ, у пагоне за колькасьцю ў росьце, пачала ўжо прымаць кулакоў. У комсамол прыняты Марціновіч Х., Каючэня Сьцяпан і Русаковіч П., якім дадзена цьвёрдае заданьне: Райком комсамолу мабыць таксама ня сочыць за тым, каго прымаюць ячэйкі, бо гэтыя цьвёрдазаданьнікі райкомам таксама зацьверджаны.

Патрэбна неадкладна ачысьціцца ад кулацкіх сынкоў. Кіраўніцтва ячэйкі, запусьціўшае [illegible] палітыкі росту, павінна быць неадкладна прыцягнута да суровай адказнасьці.

С. Пятрус

Торпазаводам—2.000!

НЕ САБОТАВАЦЬ ГІСТАРЫЧНЫ АБАВЯЗАК!

ЛКСМБ НЯ ВЫКАНАЎ ЯШЧЭ ЎЗЯТЫЯ АБАВЯЗКІ ПА МОБІЛІЗАЦЫІ 2000 КОМСАМОЛЬЦАЎ НА ТОРПАЗАВОДЫ

ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ЗРЫЎШЧЫКАЎ МОБІЛІЗАЦЫІ 2000!

Трэці пленум ЦК ЛКСМБ вынес пастанову аб мобілізацыі дадатковай тысячы комсамольцаў на торпазаводы. Мобілізацыя 2000—задача, якая павінна ў значнай меры вырашыць посьпех сёлетняга сэзону і забясьпечыць беларускую прамысловасьць апалам.

Весткі з месц сьведчаць аб тым, што рад комсамольскіх організацый падышоў да мобілізацыі надзвычайна казённа, што ўрокі Койданаўскага кіраўніцтва яшчэ шмат каго не навучылі як неабходна змагацца за выкананьне тых адказных задач ленінскага комсамолу.

Мы лічым неабходным адзначыць недастатковую опэрацыйную работу эконом-масавага аддзелу ЦК ЛКСМБ, які не забясьпечыў яшчэ патрэбным чынам неабходнай барацьбы за выкананьне вызначаных задач.

Комсамольскія тысячы павінны быць дадзены. Неабходна зьняць з працы тых, хто ня здолеў выканаць гэту задачу.

Зрабіць патрэбныя вывады

Рад комсамольскіх організацый вельмі нядбайна аднёсься да мобілізацыі комсамольцаў на торпараспрацоўкі. Ня толькі кантрольныя лічбы ня выкананы, але і пасланыя на распрацоўкі кадры нават не замацаваны за торпзаводам і не далі патрэбнага зруху ў выкананьні пляваў торпздабычы.

Значная колькасьць комсамольцаў, пасланых з розных організацый на торпзавод „Бальшавік" (станцыя Канстанцінаўка), ужо пакінула завод.

З Гомельскага раёну кінулі працу комсамольцы Пэўзнэр і Красны, з Уваравіцкага—Старадубцаў, Скарына, Масюкоў, Сырцоў, Кундзелеў, Барабанаў, Аўраменка, з Чачэрскага—Буракоў і Цуманкоў, з Камарынскага Цамоленка А. і Цамоленка Ф., з Кармянскага—Карначова Ніна, з Веткаўскага—Саковіч і Жлобінскага раёну—Наўменка Р.

Гэты сьпіс сьведчыць аб тым, што да мобілізацыі комсамольцаў аднесьліся без патрэбнай увагі, ня ня прыдалі ёй належнага значэньня.

Комсамольцаў, якія не апраўдалі сябе як комсамольцы на гэтым адказным вучастку, трэба выкінуць з радоў ленінскага комсамолу, як дэзэртыраў з фронту барацьбы за тарпяны Донбас.

А. І.

Засталося толькі 18

У 5-ым пасёлку Асінторфу налічваецца 400 чалавек комсамольцаў і рабочае моладзі, але ніякай работы сярод іх не разгарнута. Толькі за апошні час, пасьля зьмены кіраўніцтва, вызначыўся някаторы зрух у рабоце.

Комсамольцы, прысланыя па мобілізацыі 2000, зусім слаба ўдзельнічаюць у грамадзкім жыцьці торпзаводу.

Высьветлілася, што раённыя організацыі падыйшлі да мобілізацыі вельмі ня сур'ёзна, дасылаўшы зусім слабых па стану здароў'я комсамольцаў, якія ня толькі не маглі прыступіць да работы, але адразу-ж пакінулі распрацоўкі.

Зараз з усёй колькасьці мобілізаваных засталося на працы толькі 18 чалавек, з якіх толькі 4 ужо аформленыя комсамольцы.

Усё гэта сьведчыць аб бясчынна казённых адносінах раённых організацый да пасылкі комсамольцаў на торпараспрацоўкі. З гэтага вонкаву неабходна будзе зрабіць патрэбныя вывікі.

Час, які застаўся да канца сэзону, павінен быць скарыстаны для таго, каб мобілізацыю 2.000 скончыць з посьпехам.

Асінторп. Курцэр.



У БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

„САКРЭТ" БРЫГАДЫ ФІЛІПОВІЧА—ЗРАБІЦЬ ЗДАБЫТКАМ УСІХ ЦЭХАЎ

Укараненьнем прогрэсыўнай зьдзельшчыны, ліквідацыяй абязьлічкі і ўраўнілаўкі, хутчэйшым пераводам усіх маладзёжных брыгад на гаспадарчы разрахунак—забясьпечыць выкананьне плянаў трэцяга рашаючага

Першая перамога дасягнута

(Вопыт увядзеньня прогрэсыўнай зьдзельшчыны на заводзе імя Варашылава.)

Старая тарыфная сыстэма аплаты працы на зав. імя Варашылава ня спрыяла выкананьню прамфінпляну. За 1-е паўгодзьдзе 3-га рашаючага „Варашылаўцы" недавыканалі прамфінплян на 25,71 пр. Гаспадарчы разрахунак на заводзе формальна ўведзены 1-га красавіка, а сапраўднаму толькі з 1-га чэрвеня.

Штодзенны вучот працы і якасьці продукцыі кожнага паасобку цэху, брыгады адсутнічаў. Усё гэта прывяло завод да запазычанасьці перад дзяржаваю на 783.640 руб.

На заводзе панавала ўраўнілаўка.

Брыгадзір 6-га разраду Цэхановіч за чэрвень атрымаў 157 р. амаль столькі—152 р. атрымаў рабочы Лукашэўскі—2-га разраду. Яшчэ прыклад—Акуліч, брыгадзір 7-га разраду за чэрвень атрымаў—175 р., тады як рабочы малатабоец 2-га разраду Навасадзкі—180 р.

Першае, што ўзварушыла грамадзкасьць заводу і шматтыражку—гэта пераход брыгады па зборцы гравіясартовак т. Філіповіча на прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельшчыну.

Прэміяльна-прогрэсыўная сыстэма аплата павышае продукцыйнасьць працы, зьнішчае ўраўнілаўку, дае стымул для павышэньня кваліфікацыі.

Прогрэсыўная зьдзельшчына і гаспадарчы разрахунак—неабходныя ўмовы для барацьбы за выкананьне бальшавіцкага прамфінпляну.

Вопыт варашылаўцаў—лепшы сьведка таго, як неабходна організоўваць работу і, на гэтых прынцыпах, дамагацца перамог.

Вучот выпрацоўкі вядзецца наступным чынам:

Калі брыгада выканае толькі норму, прыняўшы за норму 70 шт. яна атрымае па 35 руб. за штуку, альбо: 35×70—2450 р.

Калі-ж яна выпрацуе звыш нормы, прыкладам 77 шт. (перавыканае заданьне на 10 проц.), дык гэтыя 7 штук аплачваюцца па павышанай цане. Замест 35 р. за штуку, брыгада атрымае.

35×0,10=3,5 р. плюс 35 р. будзе=38 р. 50 к.

Пры складаньні гэтай шкалы ўлічваюцца ўнутраныя магчымасьці брыгады. Калі брыгада магчымасьцяў на перавыкананьне заданьня мае менш, процант прэміі павышаецца.

Вынікі працы брыгады т. Філіповіча:

Выканана за чэрвень	Заданьне	Перавыканана: лік	Перавыканана: %	Расцэнка за звыш норму
85 шт.	70 шт.	15 шт.	21 %	Замест 35 руб. за шт.—42,35 руб.

Так'м чынам, замест—35×15=525 р., за звыш норму брыгада атрымала 42,35×15=635 р. 25 к. атрымаўшы прэміі 110,25 рубля.

Па прыкладу брыгады гравіясартовак, да 17-га МЮДу пераходзіць на прогрэсыўную зьдзельшчыну „Чырвоназьменаўская" комуна ўсе асноўныя комсамольска-моладзёжныя брыгады з-ду пераходзяць на гаспадарчы разрахунак.

Кавалевіч.

У першых радох

8-ая маладзёжная істужка фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі" (Віцебск) ідзе ў першых радох барацьбы за прамфінплян. Яна зьяўляецца ініцыятарам сустрэчнага на фабрыцы і першаю перайшла на гаспадарчы разрахунак.

І. МАРГОЛІН

1-га верасьня — „Дзень вучобы"

ПРАВЯДЗЕМ ЯГО ПА-БАЯВОМУ

Да пачатку навучальнага засталося **17** ДЗЁН

1-га верасьня праводзіцца ўсебеларускі „Дзень вучобы". 1-га верасьня пачынаецца вучоба ва ўсёй сыстэме народнай асьветы і таму гэтае вялізарнае палітычнае важнасьці мерапрыемства павінна неадкладна прыцягнуць да сябе пільную ўвагу комсамолії—шэфа ўсеабучу, усіх грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці.

„Дзень вучобы" павінен мобілізаваць увагу шырокіх працоўных мас вакол выкананьня вялізарных задач культурнай рэволюцыі, вызначаных апошняй пастановай ЦК КП(б)Б аб правядзеньні новага навучальнага году.

Падрыхтоўку да „Дня вучобы" патрэбна пачаць зараз-жа. Гэтай падрыхтоўчай работай патрэбна ахапіць усе вучасткі барацьбы за сваячасовы пачатак навучальнага году, усе вучасткі культурнай рэволюцыі.

ПАСТАНОВА

Сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб правядзеньні „Дня вучобы".

1. Згадзіцца з прапановай Наркамасьветы аб правядзеньні „Дня вучобы"—1-га верасьня.

2. Даручыць ГК і РК КП(б)Б зараз-жа разгарнуць падрыхтоўчую работу да „Дня вучобы", праводзячы яе (работу) пад лёзунгам мобілізацыі мас на ліквідацыю прарываў у галіне падрыхтоўкі да навучальнага году.

3. ГК, РК КП(б)Б, НКА, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, Колгасцэнтру прыняць усе захады, каб „Дзень вучобы" 1-га верасьня ператварыць у дэмонстрацыю шырокіх працоўных мас, за ажыцьцяўленьне задач культурнай рэволюцыі.

4. Даручыць НКА распрацаваць у 3-х дзённы тэрмін канкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньню „Дня вучобы" і ўнесьці на зацьверджаньне Культпропу ЦК.

5. Прапанаваць цэнтральным і мясцовым газэтам шырока асьвятліць падрыхтоўку да „Дню вучобы" ў друку.

За бальшавіцкія тэмпы культурнай рэволюцыі

З адкрытага ліста

Да Чырвонаштандартнага настаўніцтва БССР

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна краіна Саветаў дасягнула нябывалага росту на ўсіх фронтах і вучастках соцыялістычнага будаўніцтва і ў 3-м рашаючым годзе 5-годкі завяршае фундамэнт соцыялістычнай экономікі.

ЦК КП(б)Б і Урадам БССР на 1931—32 навучальны год, перад органамі нарасьветы і ўсёй пролетарскай грамадзкасьцю—пастаўлены наступныя баявыя задачы:

Ператварэньне Савецкай Беларусі ў краіну суцэльнай пісьменнасьці, пераход у гэтым годзе ў сьлед за поўным ахопам абавязковым навучаньнем у аб'ёме пачатковай школы да ўсеагульнага навучаньня за сямігодку, політэхнізацыя ўсяе народнае асьветы, масавае разгортваньне політэхнічнага і профэсыйнага навучаньня сярод рабочых і колгасьнікаў і аўладаньне імі тэхнікай; увядзеньне ўсеагульнага абавязковага дашкольнага выхаваньня, разгортваньне сыстэмы колгасных і рабочых унівэрсытэтаў, падрыхтоўчых курсаў, завочнага навучаньня, рашучы паварот усіх культасьветных і політыка-асьветных устаноў да выкананьня прамфінпляну і соц. рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

„Выкананьне гэтых вялізарнейшых задач можа быць забясьпечана толькі пры ўмове разгортваньня шырокай падрыхтоўчай работы да новага навучальнага году, вядзеньне гэтай работы, як баявой політычнай кампаніі" (з пастановы ЦК КП(б)Б).

З мэтай выкананьня наказу ЦК КП(б)Б—у БССР 1-га верасьня праводзіцца „Дзень вучобы". Асноўная мэта „Дня вучобы"—мобілізаваць шырокія працоўныя масы навокал падрыхтоўк і організаванага пачатку новага навучальнага году.

Роля чырвонаштандартнага настаўніцтва ва ўсёй рабоце па падрыхтоўцы і правядзеньня „Дня вучобы" надзвычайна вялікая і адказная. Кожны настаўнік, які зьяўляецца байцом на фронце культурнай рэволюцыі, павінен паказаць сапраўдныя ўзоры бальшавіцкай работы за выкананьне пляну „Дня вучобы".

НКАсьветы і ЦП Саюзу Працасьветы, заклікаюць усе чырвонаштандартнае настаўніцтва БССР, па сканчэньні чарговага адпачынку, у тэрмін зьявіцца на мейсца сваёй працы, на свой баявы пост, з бальшавіцкай энэргіяй змагацца за выкананьне баявых задач культурнай рэволюцыі.

Усе сілы і сродкі на падрыхтоўку да новага навучальнага году, на спатканьне яго ў баявой гатоўнасьці.

Ні воднага дэзэртыра лятуна, прагульшчыка сярод арміі культ. фронту.

У бок за бальшавіцкія тэмпы культурнай рэволюцыі.

Няхай жыве КП(б)Б—кіраўнік новых перамог на соцыялістычным фронце.

Нам Наркома Асьветы Бялуга.
ЦП Саюза Працасьветы Дварэцкі.

РАЗГОРНЕМ МАСАВЫ ТУРЫСЦКІ РУХ

Т-ва пролетарскага турызму і экскурсій павінна стаць масавай організацыяй

Разам з шпаркім разьвіцьцём і ростам соцыялістычнага будаўніцтва Савецкай краіны, разьвіваецца і расьце культура нацыянальная па форме і пролетарская па зьмесьту. Культурны рух прымае ўсё найбольш організаваныя, новыя формы, формы, якія ахопліваюць сабою найбольш шырокія працоўныя масы.

Адной з гэткіх форм зьяўляецца турыстска-экскурсійны рух працоўных мас, асабліва моладзі.

Пролетарскі турызм і экскурсіі маюць вялізарнейшае значэньне ў справе садзейнічаньня ўзьняцьцю політычнага, вытворчага і культурнага ўзроўню шырокіх пролетарскіх, працоўных мас і мобілізацыі іх на актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве.

Для турысцкіх паходаў, экскурсій вылазак, як далёкіх, так і блізкіх выкарыстоўваецца час адпачынку працоўных, як чарговы адпачынак, так і дні адпачынку па пяцідзёнках альбо тыднях і іншыя непрацоўныя дні. Гэта дае працоўнаму турыстаму-экскурсанту культурны адпачынак і вопыт для далейшай яго працы, абагачае яго новымі ведамі, новай практыкай.

У многіх рэспубліках Савецкага Саюзу пролетарскі турызм ужо прыняў упаўне організаваны характар,—профэсыянальныя, комсамольскія і іншыя організацыі прынялі на сябе поўнае кіраўніцтва гэтым масавым рухам. **У БССР гэты рух мае ўсё яшчэ стыхійны характар.**

Ня гледзячы на адозву ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ і іншых кіруючых організацый БССР, распаўсюджаную яшчэ ў пачатку 1931 г. аб організацыі і разгортваньні работы ТПТЭ, толькі ў 7-мі раёнах яшчэ організаваны організацыйныя райгор. бюро ТПТЭ, ніякіх вынікаў работы ня відаць, ячэйкі організоўваюцца стыхійна, без усялякае дапамогі і кіраўніцтва з боку раённых організацый.

Для зруху гэтай работы ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ і оргбюро ЦСБ ТПТЭ пастанавілі правесьці дэкаднік **пролетарскага турызму і экскурсій з 5 па 15-е жніўня.** Дэкаднік павінен паслужыць магутным вагаром для масавай популярызацыі задач організацыі ТПТЭ сярод працоўных мас, асабліва сярод рабочай і колгаснай моладзі, масавай організацыі і росту ячэек ТПТЭ, пераважна на больш буйных соцыялістычных прадпрыемствах, у саўгасах, колгасах, больш буйных вёсках, і пачатку сыстэматычнай, плянавай рабоце організацыі ТПТЭ.

Перад дэкаднікам пролетарскага турызму і экскурсія пастаўлены наступныя задачы:

Шырокая популярызацыя задач ТПТЭ сярод шырокіх мас рабочых, колгасьнікаў і ўсіх працоўных, увязваючы з задачамі соцыялістычнага будаўніцтва, з задачамі трэцяга, рашаючага году пяцігодкі.

Прыцягненьне ўвагі партыйных комсамольскіх, профэсыйных і іншых грамадзкіх організацый да ТПТЭ.

Узмацненьне існуючай сеткі ячэек ТПТЭ і далейшы рост іх.

Рост організацыі ТПТЭ на 1931 г. вызначаны па БССР ня менш як 16000 членаў. ЦК ЛКСМБ пастанавіў за час дэкадніка давесьці організацыю ТПТЭ да 100.000 членаў.

Усе гэтыя задачы могуць быць поўнасьцю выкананы толькі пры дастатковай увазе да гэтай кампаніі. Комсамольскія і профэсыянальныя організацыі сумесна з горрайоргбюро ТПТЭ павінны прыняць на сябе ўсю адказнасьць за выкананьне задач, пастаўленых перад дэкаднікамі.

Вышэйпамянёнай пастановай ЦК ЛКСМБ прапануецца ўсім раённым комсамольскім організацыям вылучыць у склад раённых і гарадзкіх оргбюро ТПТЭ сваіх прадстаўнікоў, забясьпечыўшы за імі кіраўніцтва. Такое-ж кіраўніцтва павінна быць забясьпечана і ў ячэйках ТПТЭ.

Популярызацыя організацыі ТПТЭ павінна праводзіцца шляхам пастаноўкі дакладаў, лекцый і інш. на масавых сходах працоўных, на тэму аб мэтах і задачах ТПТЭ, аб выніках зробленых турысцкіх паходаў, экскурсій, як групавых, так і паасобных турысцкіх бываўшых у паходах, а таксама паказам конкрэтнай работы турорганізацыі.

Выходзячы з задач, якія стаяць перад таварыствам пролетарскага турызму і экскурсіі, кожная ячэйка ТПТЭ, як існаваўшая, так і ўноў організаваная, павінна ў час дэкадніка організаваць масавыя, а таксама брыгадныя паходы, экскурсіі, вылазкі (пяхотой, на ве́лёсыпэдах і інш), на бліжэйшыя прадпрыемствы, саўгасы, колгасы, МТС, выкарыстоўваючы дзеля гэтага ўсе дні адпачынку і вольныя вечары, у мэтах дапамогі ў выкананьні важнейшых задач 3-га, рашаючага году пяцігодкі—уборкі ўраджаю, загатоўка кармоў, падрыхтоўкі да асеньняй пасяўной кампаніі, дапамогі саўгасам, колгасам у складаньні норм выпрацоўкі, падліку працы, распаўсюджваньне пазыкі трэцяга, рашаючага году пяцігодкі, абмену вопытам, ліквідацыі прарываў на прадпрыемствах і інш., прапагандуючы разам з гэтым ідэі ТПТЭ і організуючы ячэйкі ТПТЭ на наведваемых прадпрыемствах, колгасах, установах.

Такіх паходаў, экскурсіі кожнай ячэйкі ТПТЭ за час дэкадніка павінна быць зроблена ня менш 2-х 3-х з падвядзеньнем рэальных вынікаў іх і далейшым замацаваньнем сыстэматычнай, плянавай работы.

Нарановіч.

Паведамленьне

Усесаюзны зьезд польскіх пролетарскіх пісьменьнікаў адбудзецца ў Менску 17 жніўня г. г.

Парадак дня:

1. Задачы пролетарскай літаратуры;
2. Стан і бліжэйшыя задачы польскай пролетарскай літаратуры ў СССР.
3. Пытаньні організацыйныя і кадраў.

Організацыйная камісія.

Профорганізацыі забясьпечце баявы ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні XVII МЮД'у

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ ад 6-III-1931 г.

Надаючы асаблівае політычнае значэньне правядзеньню XVII МЮД'у, які будзе праходзіць пад знакам барацьбы [illegible] рабочае клясы ўсяго сьвету, уцягненьне ў клясавую барацьбу шырокіх мас працоўнае моладзі капіталістычных краін, абароны і умацаваньня СССР—бацькаўшчыны сусьветнага пролетарыяту і ўзброеньня сусьветнага комсамолу вопытам рэволюцыйнай барацьбы комсамолу Савецкага Саюзу.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанаўляе:

1. Усім ЦП, Гаррайпрофсаветам і ФЗМК надаць масавы характар падрыхтоўцы і правядзеньню XVII МЮДу аказаньнем ўсямерную дапамогу комсамольскім організацыям у правядзеньні задач адкрытага ліста ЦК УсеЛКСМ і пастан. Бюро ЦК ЛКСМБ сярод комсамольцаў, рабочай і працоўнай моладзі і дарослых рабочых.

2. Усім профорганізацыям зьвязацца з мясцовымі комсамольскімі камітэтамі і намеціць практычныя мерапрыемствы па забясьпечаньню актыўнага ўдзелу профорганізацый на ўсёй падрыхтоўчай рабоце па правядзеньню МЮД'у.

Абавязаць Менгарпрофсавет забясьпечыць свой конкрэтны ўдзел у мобілізацыі рабочых мас на ажыцьцяўленьне програмы дзейнічаньня Менскага комсамолу да XVII МЮДу.

3. Усю падрыхтоўчую работу па правядзеньню МЮД'у неабходна скарыстаць для баявой работы комсамолу, усёй рабочай і працоўнай моладзі на разгортваньне сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў на ўсіх вучастках соцбудаўніцтва.

ЦСПСБ прапануе ўсім профорганізацыям мобілізаваць увагу рабочае моладзі і ўсіх дарослых рабочых на выкананьне гігантскіх задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну трэцяга кварталу, на бальшавіцкае правядзеньне ўборачнай і асеньняй пасяўкампаніі, рэалізацыю пазыкі трэцяга рашаючага.

Улічваючы ў аказаньні практычнай дапамогі комсамолу па выкананьню задач абвешчанага 3-х месячнага штурму ленінскага комсамолу па сваячасовому пуску новых 518 і 1040 гігантаў соцыялістычнай індустрыі.

4. Асобную ўвагу неабходна ўдзяліць у сувязі з XVII МЮДам пытаньням зьвярненьня 100 проц. ахопу соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам не толькі комсамольцаў, але і ўсёй рабочай моладзі і ўсёй рабочай масы, узьняць соцспаборніцтва і ўдарніцтва на вышэйшую ступень, дабіваючыся к XVII МЮДу поўнага пераводу на гаспадарчы разрахунак усіх маладзёжных брыгад, цэхаў, [illegible] ахапіць усю рабочую моладзь тэхнічнай вучобай.

5. Надаючы выключнае значэньне пытаньню высоўваньня рабочае моладзі на адказную кіруючую работу ў профсаюзах, гаспадарцы, савецкія і кооп. органы, ЦСПСБ абавязвае ўсе профорганізацыі аказаць належную дапамогу комсамолу ў высоўваньні пастан. Бюро ЦК ЛКСМБ аб высоўваньні ў падарунак XVII МЮДу лепшых ударнікаў на адказную кіруючую работу, высоўваньне ўдарных рабочых мас вакол вылучэньня 100 комсамольцаў—лепшых ударнікаў на тарыфна-нормировачную працу, 300 комсамольцаў на работу ў кооперацыю, 50 комсамольцаў у камунальную гаспадарку, 50 комсамольцаў на агульную адказную кіруючую профсаюзную і гаспадарчую работу, 1000 комсамольцаў — на [illegible] і аб [illegible] мобілізаваных 2000 на [illegible].

6. Прапанаваць культсэктару прафсаюзаў [illegible] на работу ў ТНБ праз 2-х месячныя курсы, абавязаць цэнт. праўленьні кооперацыі і дзярж. гандлю, комун. гаспадаркі, гар. прадпрыемстваў, [illegible] прамысловасьці [illegible] і ФЗМК сумесна з комсамольскімі організацыямі распрацаваць практычныя мерапрыемствы па забясьпечаньню [illegible] іх нормальнымі ўмовамі працы.

7. Адным з галоўных момантаў ўсёй падрыхтоўчай работы і правядзеньня МЮД'у павінна зьяўляцца ўзмацненьне інтэрнацыянальнага выхаваньня сярод рабочае моладзі і дарослых рабочых.

Дабіцца каб да МЮД'у 100 проц. рабочае моладзі было ахоплена радамі МОПР'у, [illegible] арганізацыю пры кожным прадпрыемстве гуртку па вывучэньню гісторыі рэволюцыйнага юнацкага руху, наладжваньне пісьмовай сувязі з замежнымі рэволюцыйнымі юнацкімі організацыямі. Палепшыць культурна-масавую палітыка-выхаваўчую работу сярод нацменшасьцяў.

8. Профорганізацыям неабходна разгарнуць практычную работу па [illegible] маладзёжным брыгадам, істужкам агрэгатам у справе [illegible] ударных падарункаў XVII МЮД'у звыш пляну. Аднача сова разгарнуць належную работу сярод дарослых рабочых-ударнікаў, якая забясьпечвала-б іх удзел у правядзеньні МЮД'у, выпускаць [illegible] звыш пляну.

9. Адным з галоўных лёзунгаў к дню XVII МЮД'у [illegible] ЦСПСБ прапануе ўсім профорганізацыям разгарнуць масавую палітыка-выхаваўчую работу, забясьпечыўшы [illegible] комсамолу.

10. Даручыць культ. і соцбыт сэктарам ЦСПСБ разам з ЦК ЛКСМБ намеціць практычныя мерапрыемствы па пытаньню паляпшэньня [illegible] культурна-масавай і культурна-бытавой работы сярод рабочае моладзі, на перабудаваньне рабочых пасёлкаў, агульных памяшканьняў, баракаў, бытавых камун у сапраўдныя ачагі соцыялістычнага быту. Лічыць мэтазгодным [illegible] ўсебеларускі агляд бытавых установ, уключыўшы ўсю рабочую моладзь у барацьбу з бескультур'ем.

11. Абавязаць усе профорганізацыі [illegible] клубы аказаць актыўны ўдзел у афармленьні МЮДаўскіх сьвят скліканьнем сходаў, правядзеньнем дэмонстрацый, прыбіраньнем гарадоў, раёнаў, прадпрыемстваў, колгасаў, саўгасаў [illegible].

12. Прэзыдыум ЦСПСБ лічыць што правядзеньне XVII МЮД'у як сьвята барацьбы і перамог пролетарскае моладзі, здабытых пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі на ўсіх вучастках соцбудаўніцтва, павінна быць справай не толькі комсамолу, але і ўсіх профорганізацый.

Да XVII МЮД'у

— 28-га жніўня камісія пры ЦК ЛКСМБ па правядзеньню МЮД'у організуе шырокае пасяджаньне з комсамольскім актывам на радыё. Пасяджаньне падагуліць вынікі падрыхтоўкі да МЮД'у. Са справаздачамі выступяць некаторыя раёны.

— З мэтай палепшыць культурна-бытавыя ўмовы рабочае моладзі к XVII МЮД'у на радзе прадпрыемстваў організоўваюцца бытавыя комуны.

— Ячэйкі ЛКСМБ, якія знаходзяцца навокал будаўніцтва Барковіцкага і Бігосаўскага ільназаводаў, бяруць шэфства над будаўніцтвам гэтых ільназаводаў і абавязваюцца дабіцца сваячасовага скончаньня будаўніцтва.

— У дзень МЮД'у ў масавых комсамольскіх дэмонстрацыях прымуць удзел [illegible].

— Профорганізацыя будаўнікоў з колектывам ЛКСМБ будаўніцтва правядуць ударную работу па скончаньню да XVII МЮД'у капітальнага будаўніцтва ФЗВ.

Да XVII МЮД'у ЦК ЛКСМБ накіроўвае на працу ў ТНБ 100 чалавек. Усе 100 пройдуць кароткатэрміновыя курсы.

— 26 выдатных комсамольцаў заводу „Комунар" 10 жніўня працавалі ў колгасах падшэфнага Караніцкага сельсавету. 17 жніўня ідуць працаваць 15 чалавек.

— Лепшыя цэхі, брыгады і паасобныя ўдарнікі ў дзень XVII МЮД'у будуць прадстаўлены да ўзнагароды ордэнам Працоўнага сьцягу.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

17-га жніўня, а 3-й гадзіне дня, у памяшканьні клубу імя 13-годзьдзя Кастрычніка (былая царква) БелТРАМ, Менгарком ЛКСМБ і рэдакцыя газэты „Чырвоная зьмена" склікаюць нараду.

АБ ШЛЯХОХ САВЕЦКАЙ ОПЭРЭТЫ

Запрашаюцца прыняць удзел у рабоце нарады: т. т. Канакоцін, Рыўлін (ЦК КП(б)Б), Рубінчык (ЦК ЛКСМБ), Гурэцкі, Марголін (ЦП Працмастацтва), Максакаў (музкомэдыя), колектыў музкомэдыі, Александровіч, Харык, П. Галавач (БелАПП), В. Сташэўскі, [illegible] (Драмтавариства), Шамшур (Галоўмастацтва), Любан, Бэндэ, Вольскі, Клімковіч (ЦСПСБ), Прагін, Саньнікаў (УВП), актыў яўТРАМ'у, актыў тэатру Кумельскага, культпропы, колектывы ЛКСМБ заводаў імя Варашылава, „Комунар", чыгуначнікаў, „Бальшавік".

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599